Bielarus557c.qxd 5/29/2009 3:19 PM Page 3

Жыве Беларусь!

# БЕЛАРУС

Address: P. O. Box 3225
Farmingdale, NY 11735

BIELARUS/Belarusan newspaper in Free World ISSN 1054-9455
Published by the Belarusan American Association, Inc.

№ 557 Чэрвень 2009 г.
Год выданьня 58

## Сустрэча ў Празе

У Празе 7 травеня адбылася сустрэча міністра замежных справаў Чэхіі Карэла Шварцэнбэрга з старшынёй Рады БНР Івонкай Сурвіллай і былымі кандыдатамі ў прэзыдэнты Беларусі Аляксандрам Казуліным, Аляксандрам Мілінкевічам, Зянонам Пазьняком і Станіславам Шушкевічам.

Кіраўнік зьнешнепалітычнага ведамства Чэхіі, якая цяпер старшыніе ў Эўразьвязе, прымаў беларускіх палітыкаў перад пачаткам саміту "Ўсходняга партнэрства" ў Празе. На сустрэчы абмяркоўваліся прапановы прадстаўнікоў беларускага грамадзтва ў дачыненьні да гэтай праграмы.

На прэсавай канфэрэнцыі па выніках сустрэчы Карэл Шварцэнбэрг сказаў, што для яго вялікі гонар – вітаць прадстаўнікоў беларускай дэмакратычнай апазыцыі. "Беларусь ня толькі з геаграфічных прычынаў нам вельмі блізкая. У Чэскай Рэспубліцы шмат беларусаў, якія тут вучацца і жывуць. Для мяне вельмі важна, што мы абмяркоўвалі канкрэтныя крокі па падтрымцы беларускай культуры і грамадзянскай супольнасьці," – сказаў міністар.



Кіраўнік арганізацыі "Грамадзянская Беларусь", былы дысыдэнт і міністар Ян Румл нагадаў пра палітычных зьняволеных, якія цяпер ёсьць у Беларусі, акцэнтаваўшы ўвагу на галадоўцы Мікалая Аўтуховіча.

Ацэньваючы вынікі сустрэчы, Івонка Сурвілла адзначыла, што "прынцыпова важна, каб Беларусь увайшла ў праграму "Ўсходняга партнэрства" на нармальных умовах, а не другараднай краінай".

На думку Аляксандра Мілінкевіча, "сёньня гістарычны дзень. Пасьля доўгіх гадоў адсутнасьці ў эўраінтэграцыі мы робім першы крок, каб аднавіць сваё месца ў эўрапейскай сям'і".

Зянон Пазьняк адзначыў даўнія традыцыі беларуска-чэскіх культурных сувязяў, нагадаўшы, што менавіта ў Празе Францыск Скарына надрукаваў першыя беларускія кнігі. "Рэжым Лукашэнкі вельмі жорсткі ў адносінах да свайго народу, да сваёй культуры і да мовы, таму на гэтых тэмах была акцэнтацыя падчас гутаркі".

Напярэдадні Івонка Сурвілла, Зянон Пазьняк, Станіслаў Шушкевіч і Аляксандар Казулін выступілі з сумесснай заявай, у якой віталі ідэю "Ўсходняга партнэрства" і выказалі ўдзячнасьць Эўразьвязу за ўключэньне Беларусі ў гэтую праграму. "Мы лічым, аднак, што забесьпячэньне правоў грамадзянскай супольнасьці і кожнага чалавека павінна стаць умовай дачыненьняў з аўтарытарнай уладай Лукашэнкі і мусіць быць адзначана ў пратакольнай частцы "Партнэрства", – гаворыцца ў заяве.

У заяве таксама сказана: "У прыярытэтных кірунках дзейнасьці "Ўсходняга партнэрства" мы хацелі-б бачыць дапамогу па зьберажэньні беларускай культуры ад сыстэматычнага вынішчэньня антыбеларускім рэжымам. Мы прапануем да тых пяці пазыцыяў, вылучаных з дванаццаці патрабаваньняў Эўразьвязу да ўладаў Беларусі, дадаць шосты пункт аб забесьпячэньні свабоднага разьвіцьця беларускай культуры, адукацыі і творчасьці".

На пытаньне журналістаў Аляксандру Мілінкевічу, чаму ён не падпісаў супольную заяву, той адказаў: "Я згодны па ўсіх пунктах, за выключэньнем таго, зь якога можна зразумець, што Лукашэнка – гэта "траянскі конь" у эўрапейскай палітыцы. Гэты пункт, калі ён ня мае падставаў, шкодзіць эўрапейскай інтэграцыі Беларусі".

На пытаньне, ці не хацелі-б прадстаўнікі беларускай пазыцыі сустрэцца ў Празе з прадстаўнікамі беларускай улады, Зянон Пазьняк адказаў: "Яны зробяць усё, каб з намі не спаткацца. Мы ня супраць, але яны гэтага ня хочуць".

***Паводле Радыё Свабода***

## "Ляпіс Трубецкой" у Нью-Ёрку



Позна ўвечары 24 травеня 2009 году трыюмфальна прайшоў канцэрт беларускага гурта "ЛЯПІС ТРУБЕЦКОЙ" у Нью-Ёрку, які адбыўся на Irving Plaza, што ў трох хвілінах хады ад Юніан Сквэр на Мангэтане.

"Беларусь! Беларусь!" падтрымлівала Ляпісаў заля. "Belarus Freedom!," – сьпявалі ў адказ музыкі і разьвітваючыся сказалі: "Мы для вас стараліся!".

Дзякуй, "ЛЯПІС ТРУБЕЦКОЙ", за прыемны канцэрт.

***A.S.***

***Здымак Анатоля СТАРКОВА.***

## Дрэнны немец, добры немец...

### Досьвед калектыўнага сораму ў Нямеччыне

*(Артыкул перакладзены з выдаванага ў Нямеччыне англамоўнага часапісу "Атлянтык таймс", травень 2009 г. Пытаньні гістарычнага мінулага, яго ўплыву на сьвядомасьць і самаатоеснасьць, якія закранае артыкул, могуць быць цікавымі таксама чытачам газэты "Беларус").*

***Карэспандэнт "Атлянтык таймс" працаваў больш за 50 год у ЗША, і спаткаў самыя розныя рэакцыі на сваю нямецкую тоеснасьць, ад перадузятай нецярпімасьці да самага цёплага прыёму.***

***Увэ Зіман-Нэто***

Амэрыканскі тэлевядучы Глен Бэк мае прозьвішча больш нямецкае, чым маю я, і выглядае таксама на самага сапраўднага немца. Нядаўна ягоны калега Біл О'Рэйлі ўзяў у яго інтэрвію, і там О'Рэйлі між іншага заўважыў: "Я — ірляндзкі амэрыканец, а вы — нямецкі амэрыканец". На гэта Бэк замахаў рукамі: "О не, не! Я — проста амэрыканец". У Амэрыцы жыве 49 мільёнаў нямецкіх амэрыканцаў. Яны складаюць 17% насельніцтва ЗША, лічбова пераважаючы сваіх суайчыньнікаў-амэрыканцаў ірляндзкага і ангельскага паходжаньня. Ірляндзкія амэрыканцы не саромеюцца свайго паходжаньня, як не саромеюцца яго англа-амэрыканцы або італа-амэрыканцы. І хоць шмат грамадзянаў ЗША пачынаюць цікавіцца сваімі нямецкімі каранямі, рэакцыя тэлевядучага Глена Бэка досыць тыповая. І досыць нямецкая.

60 год таму, калі была заснаваная Фэдэратыўная Рэспубліка Нямеччына, я вучыўся ў школе-інтэрнаце. Я памятаю, як наш першы прэзыдэнт Тэадор Гойс распавёў пра тое, як належыць успрымаць нацыстоўскае мінулае Нямеччыны. Ён сказаў: "Тыя, хто браў удзел у злачынствах Гітлера, мусяць адчуваць не калектыўную віну, а — калектыўны сорам". Безумоўна, нават гэта не стасуецца да Бэка, які нарадзіўся ў Маўнт-Вэрнан (Вашынгтон) у 1964 годзе. Але, дзіўным чынам, Бэк адкідае свае нямецкія карані ў той самы спосаб, як шматлікія немцы з майго пакаленьня імкнуліся схаваць сваю тоеснасьць. Сёньня я ўстыдаюся прызнацца, што калі мы пачыналі езьдзіць аўтастопам па Эўропе ў 1950-я гады, мы часьцяком выдавалі сябе за швайцарцаў або галяндцаў, люксэмбуржцаў ці нават аўстрыякаў (ня гледзячы, парадаксальна, што аўстрыякам быў Гітлер).

Ад самага прыезду ў Амэрыку ў 1962 годзе ў якасьці замежнага карэспандэнта я адчуваў рэгулярна напаміны аб тым калектыўным сораме, пра які казаў Т. Гойс. Назаўтра,

***Заканчэньне на бачыне 4***

Bielarus557c.qxd 5/29/2009 3:19 PM Page 4



# Сустрэча зь Ірынай Варабей

Ірына Варабей, наша суродзічка, якая жыве ў Таронта ў Канадзе, усебакова адораная асоба. Яна – пісьменьніца, журналістка, вышывальніца, фатограф. Ірына належыць да Саюзу пісьменьнікаў Беларусі, да Тарантаўскай гільдыі вышывальніц і Канадзкай асацыяцыі вышывальніц. Яна – пераможца фатаконкурсаў часапісаў "Canadian Geographic" і "Hamber River Book". Яна рыхтуе да выданьня пераклад "Легенды Ванкувэра" Паўліны Джонсан, апрацоўвае вышыванкі са схемамі для часапісу канадзкіх дызайнэраў "A Needle Pulling Thread".

Ірына пераклала на беларускую мову аповесьць Кастуся Акулы "Tomorrow Is Yesterday", а ў 2005 годзе ў выдавецтве "Беларускі кнігазбор" выйшла кніга ейных артыкулаў, перакладаў і апавяданьняў загалоўленая "Там, дзе сэрца маё". І сапраўды, сэрца Ірыны ў Беларусі. З думкай пра Бацькаўшчыну яна й займаецца мастацкай творчасьцю.

У суботу 9 травеня адбылася сустрэча зь Ірынай Варабей ў залі царквы Жыровіцкае Маці Божай у Гайленд-Парку. Паважаную гасьцю прадставіла слухачам др. Алла Орса-Романо, коратка падаўшы пра Ірыніны якасьці й заслугі. Перад гэтым удзельнікі сустрэчы мелі нагоду агледзець невялікую выстаўку альбомаў і вышыванак мастачкі, набыць ейную кнігу. У ліку экспанатаў былі ейныя выдатныя працы-вышыванкі: партрэт мітрапаліта Мікалая, Мірскі замак і зімовы беларускі пэйзаж.

Спн. Варабей сказала, што яна пастанавіла папулярызаваць імя Беларусі пры дапамозе вышывальнага мастацтва. Яна зрабіла параўнаньне беларускага й канадзкага вышывальніцтва й адзначала, што тэхніка вышыўкі ў Паўночнай Амэрыцы больш распрацаваная, вытанчаная й шматбаковая. Ірына паведаміла, што ў Таронта двойчы на год, у красавіку й кастрычніку, адбываюцца вялікія зьезды вышывальніцтваў з усяе Паўночнае Амэрыкі. На іх можна пабачыць, якая вялікая адлегласьць ад традыцыйнага беларускага вышывальніцтва да мадэрнага. Адлегласьць гэтую й стараецца скараціць спн. Ірына Варабей сваім шматбаковым талентам і самааддачай працавітасьцю.

***(Я.З.)***

# Пратэсты ў Празе

Удзень адкрыцьця саміту "Усходняга партнэрства" (7 травеня) больш за сотню беларусаў пратэставалі ў Празе супраць парушэньня правоў чалавека ў Беларусі.

У акцыі ўзялі ўдзел беларускія палітэмігранты, якія пражываюць у Чэхіі і іншых эўрапейскіх краінах, а таксама жыхары Прагі. Пасьля заканчэньня мітынгу ўдзельнікі акцыі правялі шэсьце да Кангрэс-цэнтру, дзе павінен быў адбудзецца саміт.

Удзельнікі шэсьця несьлі плякаты зь лёзунгамі "Свабоду палітвязьням!", "Не Лукашэнку ў Эўропе!", "Свабоду Беларусі!", "Не дыктатуры!". Над калёнай лунаілі бел-чырвона-белыя сьцягі. Жыхары Прагі вельмі добразычліва паставіліся да ўдзельнікаў акцыі і жадалі хучэйшага зьвяржэньня дыктатуры.




Дэлегацыі краін-удзельніц "Усходняга партнэрства" прыбыталі ўдзельнікаў акцыі пратэсту. Беларускую дэлегацыю прывезьлі да будынка Кангрэс-цэнтру на браніраваным аўтамабілі. Яны хутка прайшлі каля пратэстуючых у суправаджэньні ахоўы і адразу схаваліся ў будынку. Удзельнікі акцыі пратэсту сустрэлі прадстаўнікоў беларускага рэжыму сьвістам і скандаваньнем лёзунгаў "Жыве Беларусь!" і "Ганьба!".

Да дэманстрантаў выйшаў прэм'ер-міністар Чэхіі Мірэк Тапаланек, які выказаў салідарнасьць з удзельнікамі акцыі пратэсту і запэўніў іх, што эўрапейскія палітыкі ведаюць аб тым, што ў Беларусі ёсьць палітвязьні, і Эўропа ня мае намеру паступацца прынцыпамі дэмакратыі.

***Паводле Радыё Свабода***

# Сустрэча з суродзічамі

У Фундацыі імя П. Крэчэўскага 7 травеня адбылася сустрэча з прадстаўнікамі Беларусі, якія прыехалі ў ЗША ў межах праграмы Дзяржпэпартамэнту "Міжнароднае лідэрства". Сярод пяці ўдзельнікаў дэлегацыі былі прадстаўнікі трох рэлігійных канфэсіяў .

Напачатку сустрэчы старшыня нью-ёрскага аддзелу БАЗА Віталь Зайка распавёў пра БАЗА і яго дзейнасьць у Нью-Ёрку, а старшыня Галоўнай Управы БАЗА Вячка Станкевіч пра дзейнасьць арганізацыі ў краіне па-за Нью-Ёркам.

Пасьля гэтага слова далі госьцям. Першым прамоўцам быў сп. Васіль Юрэвіч, адміністратар царквы "Новае Жыцьцё" хрысьціянаў поўнага Эвангельля (Менск). Ён распавёў пра стан свабоды сумленьня ў Беларусі, узгадаў акты перасьледу сваёй царквы з боку ўладаў Беларусі і адзначыў, што вернікі дабіваюцца права свабодна вызнаваць сваю веру, маліцца супольна з сваімі братамі і сёстрамі. Улады ўжо чацьвёрты год, перасьледуць царкву, шукаюць зачэпак, каб выселіць яе з будынку — былога кароўніка, які быў куплены ў саўгаса, калі царкве раз за разам адмаўлялі ў памешканьні ў Менску. Цяпер вёска Сухарава стала часткай гораду, і ўлады заяўляюць, што будынак царквы не адпавядае генэральнаму пляну забудовы. Суд вырашыў справу не на карысьць царквы, і цяпер яна знаходзіцца "ў малітоўным стане". Вернікі выступаюць за зьмену заканадаўства, каб яно сапраўды адпавядала патрэбам людзей і абараняла сапраўдную, а не дэкляратыўную, свабоду. На карысьць зьменаў былі сабраныя подпісы 50 тысяч чалавек.



Здымак А. СТАРКОВА

Наступным выказаўся сп. Віталь Рымашэўскі, сустаршыня партыі Беларуская Хрысьціянская Дэмакратыя (БХД). Ён распавёў пра сваю партыю, устаноўчы зьезд якой адбыўся ў Менску 28 лютага сёлета. (На час напісаньня артыкулу стала вядома, што Міністэрства юстыцыі адмовіла БХД у рэгістрацыі). БХД выступае за сацыяльна арыентаваную рынкавую дэмакратыю, за хрысьціянскія каштоўнасьці ў палітыцы. Сябры партыі ўважаюць, што палітычная дзейнасьць у Беларусі павінна весьціся паіншаму, чым вялася дасюль. Партыя налічвае 1500 сяброў. На людзей, чые імёны знаходзяцца ў рэгістрацыйным сьпісе, улады аказваюць моцны ціск, каб адклікалі свае подпісы. Аднак з 1067 чалавек адмовіліся ад подпісу толькі каля 5. Далей сп. Рымашэўскі распавёў пра дзейнасьць сябраў партыі, пра "Антыкамуністычны форум" і праект "Пакаяньне", а таксама праект "За сямейныя каштоўнасьці", канфэрэнцыю па гісторыі Беларускага хрысьціянска-дэмакратычнага руху і партыю-папярэдніцу сёньняшняй БХД (пад кіраўніцтвам а. а. В. Гадлеўскага і А. Станкевіча). Шмат робіцца ў галіне беларускай культуры: арганізаваныя курсы беларускай мовы, гісторыі хрысьціянства ў Беларусі. Партыя мае ў сваіх шэрагах прадстаўнікоў усіх хрысьціянскіх канфэсіяў, а таксама нехрысьціянскіх рэлігіяў. Вядзецца супрацоўніцтва з хрысьціянска-дэмакратычнымі партыямі Летувы, Нямеччыны, Галяндыі.

Наступнай узяла слова прадстаўніца гэбрайскай грамады, сп-ня Іна Герасімава, дырэктарка Гэбрайскага музэю гісторыі й культуры (Менск). Яна на добрай беларускай мове распавяла аб працы дэлегацыі, аб месцах, дзе пабывалі ў ЗША, і сустрэчах. Спня Герасімава таксама распавяла пра фонды і дзейнасьць, друкаваныя выданьні музэю, супрацоўнікаў і сваю працу, лашэйна зьвяртаецца прадстаўнікамі...

Сп. Дзьмітры Падлобка з Гомелю, сьвятар пратэстанцкай царквы "Новая Вера" (хрысьціянаў поўнага Эвангельля), пачаў гутарку па-беларуску, але потым працягваў па-расейску. "Вельмі прыемна бачыць і чуць землякоў за шмат тысяч міляў ад Бацькаўшчыны. Мы ў нашай царкве шмат працуем з гаротнікамі, людзямі, якім патрэбная дапамога. Шмат хто пакутуе. І мы таксама думаем, што можам зрабіць, каб зьмяніць нашую краіну. Мы адносім сябе да арганізацыў, якія ня хочуць падпарадкоўвацца плыні, проста плыць, куды вынесе."

Сп-чня Вольга Алейнік працуе дарадцай у справах Усходняй Эўропы Царкоўна-Місійнага Таварыства, перад тым супрацоўнічала ў Сусьветнай суполцы праваслаўнай моладзі "Сындэсмас" і ў Брацтве Трох Віленскіх Мучанікаў. Яна коратка спынілася на рэлігійнай сытуацыі ў Беларусі і распавяла пра сваю працу з праваслаўнай моладзю, а таксама пра дзейнасьць праваслаўных брацтваў у Беларусі.

Затым госьці адказалі на пытаньні прысутных, сярод якіх быў архіяпіскап БАП(Н)Ц і Сусьветнага Амэрыканскага Патрыярхату Уладыка Юры. Ён пытаўся пра тое, ці ведаюць госьці пра дзейнасьць БАП(Н)Ц у Беларусі, і чаму няма беларускамоўных сьвятароў, чаму праваслаўныя беларусы на Бацькаўшчыне застаюцца пад кіраўніцтвам РПЦ. Падчас адказаў адбылася невялікая дыскусія, але было канстатавана, што вера і перакананьні мусяць яднаць беларусаў, а не падзяляць іх. Сп. В. Рымашэўскі адзначыў, што ў пляне супрацоўніцтва зь беларускай грамадой Амэрыкі было-б добра, каб БАЗА мела інфармацыйныя буклеты, якія можна было-б распаўсюдзіць сярод розных групаў зь Беларусі, якія наведваюць ЗША па лініі кантактаў амэрыканскіх дзяржаўных і недзяржаўных арганізацыяў.

***Віталь ЗАЙКА***

# Зьмякчэньне санкцыяў падоўжана

Агенцтва БелаПАН паведаміла, што Міністэрства фінансаў ЗША падоўжыла да 30 лістапада рашэньне зьмякчыць санкцыяў да беларускіх прадпрыемстваў — "Лакафарба" і "Полацк-Шкловалакно", якія ўваходзяць у "Белнафтахім".

Згодна з дакумэнтам, апублікаваным на сайце Мінфіну ЗША, амэрыканскім грамадзянам дазволена супрацоўніцтва з гэтымі прадпрыемствамі да 30 лістапада 2009 году. У той-жа час уласнасьць гэтых двух прадпрыемстваў застаецца заблякаванай у адпаведнасьці з урадавым распараджэньнем № 13405. "Грамадзянам ЗША таксама забаронена праз або пры пасрэдніцтве прадпрыемстваў "Лакафарба" і "Полацк-Шкловалакно" купляць прадукцыю, паслугі і тэхналёгіі ў іншых суб'ектаў гаспадараньня, унесеных у сьпіс", — гаворыцца ў паведамленьні.

У лістападзе 2007 г. ЗША ўвялі эканамічныя санкцыі да канцэрну "Белнафтахім" у сувязі з парушэньнем правоў чалавека ў Беларусі. У сакавіку 2008 г. адносіны пагоршыліся, і паслы былі адкліканыя для кансультацыяў. 5 верасьня летась Мінфін ЗША на паўгода зьмякчыў санкцыі. У лютым 2009 г. дзеяньне гэтага рашэньня было прадоўжана да 1 чэрвеня.

***Паводле Радыё Свабода***

Bielarus557c.qxd 5/29/2009 3:20 PM Page 5



# Беларусь за месяц

### Сумная гадавіна

7 травеня споўнілася 10 гадоў як зьнік былы міністар унутраных спраў Юры Захаранка. Ён быў сярод тых, хто прывёў да ўлады Лукашэнку. Аднак у хуткім часе быў адпраўлены ў адстаўку і потым перайшоў у жорсткую апазыцыю да ўлады. У прыватнасьці, у 1999 г. Захаранка браў удзел у альтэрнатыўных прэзыдэнцкіх выбарах на баку Міхаіла Чыгіра, стварыў Саюз афіцэраў. Захаранка карыстаўся вялікай папулярнасьцю ў міліцэйскіх, армейскіх колах і проста сярод звычайных людзей.



Увечары 7 травеня 1999 г. некалькі чалавек бачылі, як людзі ў цывільным скруцілі мужчыну, падобнага да Захаранкі, на вуліцы Магілёўскай у цэнтры Менску, запіхнулі ў "Жыгулі" і павезлі ў бок вуліцы Жукоўскага. Зьнікненьне Захаранкі было першым таямнічым зьнікненьнем вядомых людзей

16 верасьня 1999 г. зьніклі бязь вестак лідэр тагачаснай апазыцыі Лукашэнку Віктар Ганчар і бізнесмэн Анатоль Красоўскі, а 7 ліпеня 2000 г. тэлеапэратар Дзьмітры Завадзкі. 7 красавіка 1999 г. пры падазроных абставінах памёр вядомы палітычны дзяяч Генадзь Карпенка.

У лістападзе 2000 г. генэрал-маёр міліцыі Мікалай Лапацік падаў рапарт на імя тагачаснага міністра ўнутраных спраў Уладзімера Навумава, у якім абвінаваціў Віктара Шэймана ў тым, што той даў загад на зьнішчэньне Захаранкі, Ганчара і Красоўскага. Загад, паводле Лапаціка, выканаў кіраўнік спэцатрада хуткага рэагаваньня Дзьмітры Паўлічэнка пры дапамозе міністра ўнутраных спраў Юрыя Сівакова, які перадаў пісталет, узяты зь менскага сьледчага ізалятару. У сваім рапарце Лапацік пісаў, што месцы пахаваньня трупаў Захаранкі, Ганчара і Красоўскага – спэцдзялянка на менскіх Паўночных могілках.

22 лістапада 2000 г. старшыня КДБ Уладзімер Мацкевіч і генэральны пракурор Алег Бажэлка выпісалі ордэр на арышт Паўлічэнкі. Кіраўніка СОБРа кінулі ў турму, але праз некалькі дзён выпусьцілі, а потым Лукашэнка зьняў Бажэлку і Мацкевіча са сваіх пасадаў. Мацкевіча, напрыклад, адправілі паслом у Сэрбію. Справа была хутка закрытая, але атрымала розгалас у Эўропе. Расьсьледаваньнем яе займаўся спэцыяльны дакладчык Парлямэнцкай асамблеі Рады Эўропы кіпрыёт Хрыстас Пургурыдэс. Вынікам яго місіі стала забарона на ўезд у краіны Эўразьвязу Віктару Шэйману, Юрыя Сівакову, Уладзімеру Навумаву, Дзьмітрыю Паўлічэнку, якіх падазраюць у датычнасьці да зьнікненьня вядомых асобаў.

### Галадоўка салідарнасьці

4 траўня было абвешчана пра бестэрміновую галадоўку салідарнасьці з ваўкавыскімі прадпрымальнікамі Мікалаем Аўтуховічам, Уладзімерам Асіпенкам і Юрыем Лявонавым, якія ад 8 лютага ўтрымліваюцца ў менскім сьледчым ізалятары. Прадпрымальнікаў вінавацяць у падпалах і падрывах маёмасьці ваўкавыскіх чыноўнікаў, што караецца зьняволеньнем да 12 гадоў.

16 красавіка Мікалай Аўтуховіч абвясьціў бестэрміновую галадоўку.

4 траўня галадоўку салідарнасьці з патрабаваньнем вызваленьня палітвязьняў абвясьцілі маладафронтаўцы Наста Палажанка, Мікалай Дзямідзенка, Андрэй Цянюта і Арцём Дубскі, а таксама Лявон Баршчэўскі,



Мікалай Статкевіч, Аляксандар Казулін, лідэр прадпрымальніцкага руху Алесь Макаеў – усяго 13 чалавек. Праўда, палітыкі і грамадзкія дзеячы потым выйшлі з галадоўкі, а стала трымалі яе на сядзібе БНФ Наста Палажанка, Мікола Дземідзенка і Арцём Дубскі. Акцыя не займела належнага грамадзкага рэзанансу, было відавочна, што ўлады пастараюцца "не заўважыць" галадоўкі. З просьбай спыніць акцыю да моладзі зьвярнулася Старшыня Рады БНР Івонка Сурвілла, пісьменьнік Уладзімер Арлоў. Галадоўшчыкі пратрымаліся 12 дзён, да 15 траўня, калі спынілі галадоўку на заклік беларускіх палітыкаў.

### Прэзыдэнцкая кампанія

Свайго кандыдата вылучыла Беларуская хрысьціянская дэмакратыя. Гэта Віталь Рымашэўскі. На 21 чэрвеня запланаваны Кангрэс за эўрапейскія каштоўнасьці. Хутчэй за ўсё на ім будзе названае імя аднаго з адзіных кандыдатаў. Гаворка ідзе пра лідэра незарэгістраванай Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі "Народная грамада" Мікалая Статкевіча.

Аб'яднаныя дэмакратычныя сілы зьбіраюцца на свой кангрэс увосень. Там таксама будзе названы яшчэ адзін адзіны кандыдат. Як трапна заўважыў у сваім блогу на сайце Радыё Свабода палітоляг Юры Дракахруст, наступную прэзыдэнцкую кампанію можна назваць так: Беласьнежка і сем гномаў.

### Камуністы мяняюць імя

Так пастанавіў 23 траўня пазачарговы зьезд партыі, якая належыць да дэмакратычнага лягеру. ПКБ будзе перайменаваная ўвосень, на чарговым зьездзе партыі. Найбольшую колькасьць галасоў набралі назвы Беларуская партыя левых, Партыя дэмакратыі і справядлівасьці і Партыя "Радзіма".

### Сярэдні заробак – $351

Паводле Нацыянальнага статыстычнага камітэту, сярэдні налічаны заробак у красавіку склаў 966 тыс. рублёў (гэта 351 даляр ЗША ў эквіваленце). Гэта меней, чым у Летуве і Польшчы, дзе кошты на харчы ці роўныя ці часта ніжэйшыя за беларускія.

### Будзе праспэкт Скарыны

замест праспэкта Маркса. Такое рашэньне прыняў Полацкі гарсавет напярэдадні сьвяткаваньня 1147-годзьдзя гораду.

Паводле старшыні Полацкага гарсавету Вольгі Ждановіч, рашэньне было прынятае пасьля шырокага абмеркаваньня і апытаньня грамадзкай думкі.

"Мы ніякім чынам не прымяншаем ролю Маркса ў сусьветнай філязофіі і эканоміцы, але імя Скарыны дарагое ня толькі палачанам", – сказала спадарыня Ждановіч.

### Беларус перамог на Эўрабачаньні

Праўда, Аляксандар Рыбак – грамадзянін Нарвэгіі. Калі 23-гадоваму хлопцу было пяць год, ягоныя бацькі зьехалі ў гэту краіну. Аляксандар таксама ўсталяваў рэкорд, ён набраў 387 балаў, значна болей, чым ранейшыя пераможцы. Песьню *Fairytale* паставілі на першае месца ў 16 краінах. Прадстаўнік Беларусі Пётр Ялфімаў заняў у сваім паўфінале



13-е месца (з 18-ці) і ў фінал ня трапіў.

Што да Аляксандра Рыбака – ён заўсёды падкрэсьлівае, што ён не сьпявак, а скрыпач – то цяпер мяркуюцца ягоныя гастролі, у тым ліку і прыезд у Беларусь.

### Чэмпіянат у Беларусі

На кангрэсе Міжнароднай фэдэрацыі гакею, што прайшоў 8 траўня ў швайцарскім Бэрне, Беларусь атрымала права правесьці чэмпіянат сьвету па гакеі ў 2014 годзе. За Беларусь прагаласавалі 75 з 105 дэлегатаў. Супернікамі беларусаў за права правесьці чэмпіянат былі Вэнгрыя, Латвія і Украіна.

Мяркуецца, што сусьветнае першынство пройдзе ў 2014 г. у Менску на новазбудаванай "Менск-Арэне", ды арэне, якую пачалі будаваць на ўскраіне гораду ў Чыжоўцы.

Дарэчы, беларуская зборная пасьпяхова выступіла на сёлетнім чэмпіянаце сьвету па гакеі, які прайшоў з 24 красавіка па 10 траўня ў Швайцарыі.

Падапечныя Глена Хэнлана паўтарылі посьпех 2006 г., таксама прабіўшыся ў чвэрцьфінал, дзе саступілі чэмпіёнам сьвету – зборнай Расеі (3:4). Вынікам чэмпіянату таксама стала выніковае восьмае месца зборнай Беларусі ў сусьветным рэйтынгу.

### Запрасілі Ўэйна Грэцкі

Пра гэта паведаміў на прэс-канфэрэнцыі старшыня фэдэрацыі гакею Ўладзімер Навумаў. Маўляў, славуты гакеіст, аўтар некалькіх вечных рэкордаў у Нацыянальнай гакейнай лізе сам выказаў зацікаўленасьць у прыезьдзе на гістарычную радзіму. Паводле афіцыйнай вэрсіі, яго дзед Антон Грэцкі выехаў у пачатку XX ст. у Канаду з тэрыторыі Расейскай імпэрыі, а менавіта Гарадзенскай губэрні. Сам Уэйн Грэцкі нарадзіўся ў 1960 г. у Брантфардзе (штат Антарыё), гарадку непадалёку ад Гамільтану, дзе была, дарэчы, моцная суполка Згуртаваньня Беларусаў Канады.

*Уласны карэспандэнт*



# ПАРТНЭРСТВА І ІНТАРЭСЫ

*(Ліст да сяброў Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ і Беларускага Народнага Фронту "Адраджэньне")*

7-га траўня ў Празе на саміце Эўразьвязу была прынятая і зацьверджаная праграма "Усходняе партнэрства." Гэтая падзея, якая патрабуе грунтоўнага асэнсаваньня. Перад самітам нам, беларусам, неабходна было ўмяшацца ў сытуацыю, каб паправіць тое, што можна паправіць. Бо, здаецца, ня ўсе ўсьведамляюць, наколькі небясьпечны паварот адбываецца ў эўрапейскай палітыцы.

Галоўная задача, якая стаяла перад намі (беларусамі з Бацькаўшчыны і замежжа) і, як вядома, перад шэрагам эўрапейскіх палітыкаў, – не дапусьціць Лукашэнку ў Прагу. Задача дасягнута. Другая задача – увесьці ў кантэкст палітыкі Эўразьвязу патрабаваньне аб абароне беларускай культуры, адукацыі і творчасьці ад вынішчэньня антыбеларускім рэжымам. Гэтая задача пастаўлена і адчыненыя магчымасьці яе ажыцьцяўленьня.

"Усходняе партнэрства" дае беларусам магчымасьць манэўру ў выпадку абвастрэньня палітычнага і эканамічнага націску з боку Расеі. Праграма прадугледжвае верагоднасьць уцягваньня беларускага грамадзтва ў сфэру эўрапейскіх дачыненьняў.

Аднак "Усходняе партнэрства" запраграмаванае на супрацоўніцтва Эўразьвязу з антыбеларускім рэжымам. Калі пачнуцца інвэстыцыі з Эўропы і сумесныя энэргетычныя праекты, усялякія размовы пра дэмакратыю і правы чалавека скончацца (яны ўжо, фактычна, скончыліся). Самая вялікая небясьпека для нас у тым, што рэжым атрымае картблянш на поўнае вынішчэньне беларускай культуры і легітымізацыю сваёй улады з рук Эўропы. У гэтым зацікаўлены рэжым і Расея (каб увесьці незаконныя пагадненьні з нелегітымным Лукашэнкам у прававое поле). Калі такое адбудзецца, тады пачнецца працэс падзелу беларускай эканомікі паміж Аб'яднанай Эўропай і Фэдэратыўнай Расеяй (дакладней, паміж эўрапейскім капіталам і расейскай эканамічнай мафіяй).

У такой сытуацыі цяперашнюю вікаўскую апазыцыю чакае поўная маргіналізацыя і адкідваньне на ўзбочыну палітычных працэсаў.

Новая апазыцыя, якая магла-б змагацца з рэжымам як сіла, павінна будзе ў новых умовах стратэгічна, тактычна і канцэптуальна зьвярнуцца да нацыянальнай ідэі і зыходзіць з нацыянальных інтарэсаў. (На нашу народную Партыю – КХП-БНФ – кладзецца вялікая адказнасьць). Калі такая шырокая нацыянальная апазыцыя ня ўзьнікне, то ня ўзьнікне ніякай.

Апазыцыйныя варожаму рэжыму нацыянальныя сілы павінны мець поўнае праграмнае забесьпячэньне па эканоміцы, сацыяльнай, фінансавай, прававой, абароннай, экалягічнай сфэрах, але аб'ядноўвацца мусілі-б на клопатах па абароне дзяржаўнай незалежнасьці, у імкненьні да свабоды і ў барацьбе за захаваньне беларускай культуры як важнейшага чыньніка сувэрэнітэту і грунту дэмакратычных пераўтварэньняў. Беларуская культура ёсьць ідэалягічная альтэрнатыва антыбеларускаму рэжыму і імпэрскай палітыцы Расеі.

Мэтай барацьбы новай беларускай апазыцыі павінен стаць катэгарычны імпэратыў: Лукашэнка нелегітымны кіраўнік і павінен пакінуць уладу.

*Заканчэньне на бачыне 5*

Bielarus557c.qxd 5/29/2009 3:20 PM Page 6



# За любоў да роднай мовы

У 2004-м годзе з прычыны моўнай сытуацыі ў Беларусі і ў якасьці майго сьціплага адказу на стаўленьне ўладаў краіны да беларускай мовы я вырашыў заснаваць прэмію “За любоў да роднай мовы”, якая-б штогод уручалася аднаму з выпускнікоў Віленскай сярэдняй школы імя Францішка Скарыны.

Пагаварыў з дырэктаркай школы Галінай Сівалавай. Яна падтрымала маю ідэю. Вызначылі памер прэміі, распрацавалі ўзор адпаведнай граматы, і... працэс пайшоў.

Першай, хто быў удастоены гэтай прэміі стала Натальля Бука (2004), затым – Маргарыта Стральчэня (2005), Анастасія Лукша (2006), Інга Лушчава (2007).

Напрыканцы 2007-га году мяне наведала чарговая думка: “А чаму-б не заснаваць мэдаля “За любоў да роднай мовы” з дадаткам да яго ўжо згаданай прэміі?”.

Зьвярнуўся да вядомага на Віленшчыне скульптара Эдуарда Падбярэзкіна. Ён таксама падтрымаў маю ідэю і неўзабаве мэдаль, адліты з бронзы і выкананы на добрым мастацкім узроўні, з аднаго боку якога красавалася выява Францішка Скарыны, а з другога – ягоны кніжны знак, быў у мяне ў руках.

Сама ідэя заснаваньня мэдаля трымалася мною ў сакрэце, таму калі напрыканцы 2007/2008 навучальнага году чарговая выпускніца школы Тацьцяна Кавальчук была ім узнагароджана (з грашовай прэміяй у дадатак), то гэта зьявілася для ўсіх прыемнай нечаканасьцю. Прычым сталася так, што адбылося гэта ў прысутнасьці старшыні Камітэту па справах рэлігій і нацыянальнасцяў пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь Леаніда Гулякі і генэральнага дырэктара Дэпартамэнту нацыянальных меншасьцяў і эміграцыі пры Ўрадзе Летувіскай Рэспублікі Антанаса Пятраўскаса.

Леанід Гуляка зьнешне ніяк не адрэагаваў на гэтую ўзнагароду, а Антанас Пятраўскас, неўзабаве пасьля яе ўручэньня, падыйшоў да мяне і сказаў, што такая ўзнагарода зрабіла-б гонар ня толькі яму, але і кіраванаму ім Дэпартамэнту, і што яна магла-б уручацца лепшым знаўцам роднай мовы ўсіх школаў нацыянальных меншасьцяў у Летуве.

Гэтыя словы не пакінулі мяне абыякавым, і 10 ліпеня 2008 году я зьвярнуўся ў Дэпартамэнт нацыянальных меншасьцяў і эміграцыі з прапановаю заснаваць такую ўзнагароду ад імя Дэпартамэнту, г. зн. ужо на дзяржаўным узроўні.

Там такой ініцыятывы з майго боку, відаць, не чакалі. Прайшоў адзін месяц, другі. Цішыня. Я вырашыў пацікавіцца лёсам сваёй прапановы. Высьветлілася, што сама ідэя Дэпартамэнту спадабалася, але што для яго не прыймальны ў якасьці ўзнагароды мэдаль. Папрасілі падумаць над альтэрнатыўнай прапановай.

27 лістапада таго-ж году я паўторна зьвярнуўся ў Дэпартамэнт. Гэтым разам з прапановаю прыняць за аснову ў якасьці ўзнагароды добрую кнігу, пры ўмове, што кніга, прызначаная для выпускніка беларускай школы будзе на беларускай мове, для выпускніка расейскай школы – на расейскай, польскай – на польскай і г. д., і абавязкова з грашовай прэміяй у дадатак.

Гэтая прапанова была прынятая і 31 студзеня 2009 году – падчас урачыстасьціў, прысьвечаных 90-годзьдзю Віленскай беларускай гімназіі і 15-годзьдзю Віленскай сярэдняй школы імя Францішка Скарыны – узнагарода пад назваю “За захаваньне і пешчаньне роднай мовы” ў выглядзе двухтомніка “Вялікае Княства Літоўскае” і грашовай прэміі, была ўручаная. Яе атрымала з рук намесьніка генэральнага дырэктара Дэпартамэнту Станіслава Відтманна вучаніца выпускной клясы школы Эвяліна Ірына Базюк.

Дзеля чаго я аб гэтым пішу? Што я хачу гэтым сказаць?

На маю думку, выказаць сваю нязгоду са стаўленьнем уладаў Беларусі да беларускай мовы можна па-рознаму. Камусьці дастаткова таго, што ён сам зьяўляецца яе носьбітам, хтосьці возьме сьцяг і пойдзе на мітынг, а хтосьці напіша манаграфію ці прачытае лекцыю. І кожная з гэтых і шматлікіх іншых формаў мае права на жыцьцё.

Важна, каб мы былі адзінымі ў сваім імкненьні да захаваньня і далейшага разьвіцця роднае мовы, каб не апускалі рукі і не давалі сябе ў крыўду.

Спадзяюся таксама, што мой прыклад можа зьявіцца неабходным штуршком для іншых, неабыякавых да сытуацыі ў Беларусі, чытачоў.

Будзьма разам!

*Старшыня Віленскага беларускага таварыства палітычных вязьняў і ссыльных*
***Валянцін СТЭХ***

# Шахматы для ўсіх

Паважаныя чытачы! Прапаную вашай увазе шахматную рубрыку, дзе буду дзяліцца з вамі шахматнымі навінамі і падзеямі. Чаму шахматы? Дык так ужо здарылася, што разам з любоўю да радзімы, да родных мясьцін, мовы і песень дасталася мне ад маіх бацькоў у спадчыну любоў да шахмат.

Мой дзед навучыўся гуляць сам, па кніжках, потым навучыў майго бацьку, потым ад бацькі навык перайшоў да мяне. Упершыню мы з бацькам селі за шахматную дошку, калі мне было 7 гадоў. Хутка пасля таго я запісалася ў шахматную школу, пачала чытаць шахматныя кніжкі, практыкавалася дома. Праз тры гады я ўжо іграла ў першынстве г. Менску, а яшчэ праз два гады заняла трэйцяе месца ў чэмпіянаце Беларусі сярод дзяўчат. Так і пачалася мая шахматная кар'ера. Шахматы сталі часткай майго жыцьця і верным спадарожнікам на доўгія гады. Шмат разоў я перамагала ў юнацкіх спаборніцтвах у Беларусі, брала ўдзел у чэмпіянатах Эўропы і сьвету. У 2000-м годзе я ўвайшла ў склад дзесяці мацнейшых шахматыстак на чэмпіянаце сьвету ў Гішпаніі. У 2003 годзе заваявала тытул майстра спорту па шахматах. З 2004 году я жыву ў ЗША, бяру ўдзел у спаборніцтвах, навучаю шахматам дзяцей.

Аматарам шахмат прапаную шахматную задачку. Ход белых – мат у два хады. Адказы свае дасылайце мне на е-мэйл адрас: *palina_churun@ yahoo.com*. Першы, хто дашле правільны адказ на задачку, атрымае прыз ад рэдакцыі газэты.

***Паліна ЧУРУН***



# Добры немец, дрэнны немец...

***Заканчэньне з бачыны 1***

як я засяліўся ў сваю нью-ёрскую кватэру, я вышаў купіць газэту ў шапіку на Першай Авэню. Мяркуючы, што я брытанец, іншы мужчына-пакупнік спытаў: “Адкуль у Англіі вы паходзіце?” Я адказаў, што я немец, народжаны ў Ляйпцыгу. Ён сказаў: “Я таксама быў у Ляйпцыгу на бамбавіку ў 1944-м. Шкада, што я тады ня трапіў у цябе”. Ён пашкадаваў, што не забіў мяне, тады 7-гадовага хлопчыка. Праз некаторы час я браў інтэрвію ў афіцыйнай асобы з гэбрайскай рэстытуцыйнай агенцыі. Здаецца, імя асобы было Ганс Мюлер, больш тыпова нямецкае за маё. “Перад тым, як вы пачнеце задаваць пытаньні, я пакажу Вам нешта. Ён адчыніў шуфляду і паказаў мне свой ваенны ордэн часоў Першай сусьветнай вайны. “Тады я быў лейтэнантам і вялікім патрыётам Нямеччыны”. Здавалася, гэтым ён пытаўся, чаму ён, паранены і ўзнагароджаны за мужнасьць гэбрай-ветэран, мусіў уцякаць са сваёй бацькаўшчыны? Ён не вінавáціў мяне, ён спрабаваў хутчэй паразумецца са мной — сваім суайчыньнікам-немцам. І вось менавіта ў такія моманты, як гэты, мяне пранізвала найглыбейшае пачуцьцё сораму. У час, як я толькі прыехаў у Нью-Ёрк, мясьціна Вашынгтон-Гайтс была поўная былых вязьняў канцлягераў. Я пасябраваў шмат з кім з іх. Яны з цікавасьцю распытвалі пра пасьляваенную Нямеччыну. Яны частавалі мяне нямецкімі й аўстрыйскімі стравамі, сумавалі па нашай супольнай культуры, якую яны любілі, і якой не маглі забыцца.

Былі таксама іншыя выпадкі. Аднойчы рэпарцёр адной зь вядучых амэрыканскіх газэтаў абвінавáціў мяне, што я “ўсё яшчэ застаюся нацыстам”. Мы ўдвух працавалі над артыкуламі па расавым пытаньні ў Амэрыцы. Мой калега зірнуў на мой рукапіс артыкулу па-нямецку, і заўважыў слова “schwarz” (шварц, чорны). “Ідыёта! Хіба ты ня ведаеш, што ў нас у краіне слова schwarz – гэта абраза?” “Але-ж я пішу па-нямецку, для немцаў, і гэта праста значыць “чорны”!” “Не істотна! Вазьмі заміні гэтае слова! Тут у нас ніхто ня можа ўжываць расісцкіх эпітэтаў!” Ён казаў гэта абсалютова сур'ёзна, і ён быў абсалютова цьвярозы.

Часам я быў сьведкам супрацьлеглых сытуацыяў, асабліва, калі рабіў рэпартажы з паўднёвых штатаў у часы руху за грамадзянскія правы ў 1960-я. Тады шмат давялося пачуць выказваньняў кшталту: “Мы абралі ня тых альянтаў у часы Другой сусьветнай вайны!”. Мелася на ўвазе, што ЗША мусілі выступіць на баку Гітлера. Я казаў, што не падтрымліваю такіх думак, і ў адказ мяне называлі “камунякам”, хоць я быў палітычны ўцякач з камуністычнай Усходняй Нямеччыны.

Часам антынямецкі ўхіл паасобных амэрыканцаў набываў камічныя рысы. Аднойчы я пачуў дыялёг мужа і жонкі адносна выбару машыны, дзе яны з-за ягонай “нямецкасьці” адкінулі Мэрсэдэс, і спрачаліся ці лепей узяць “італьянскую” машыну “Аўды” альбо “брытанскі” БМВ. Гэта адбывалася ў сярэдзіне 1980-х гадоў, калі Рэйган нарабіў закалоту ў мэдыях, сустрэўшыся з тагачасным канцлерам Гельмутам Колем на нямецкіх вайсковых могілках у Бітбургу. Гэта павінна было стаць жэстам паразуменьня паміж немцамі й амэрыканцамі. Рэйган сказаў тады, што пахаваныя там нямецкія жаўнеры “былі таксама ахвярамі згубнага рэжыму”. Рэйган праліўчыў дакладна, ён не сказаў “у той-жа ступені ахвярамі...”. Ягоная прамова выклікала ўзбурэньне, амэрыканскае тэлебачаньне бясконца паказвала магілу загіблага жаўнера СС, якому ледзьве споўнілася 17 год.

Аднаго дня падчас гулянкі ў маёй хаце, дыскусія пра выказваньні Рэйгана пераўтварылася ў перакрыкваньне, аж пакуль мой прысутны сябар Эміль Ландаў, які перажыў Галакост, не выгукнуў з моцным нямецкім акцэнтам: “Спыніцеся! Я адзін з тут прысутных магу казаць пра гэта”. Ён закасаў рукаў, паказваючы свой канцлягерны татуяваны нумар. А потым распавёў наступную гісторыю.

Эміль быў вязьнем Асьвенцыму, досыць моцным і таму абраным для працы, а не зьнішчэньня ў газавай камэры. Ахоўнікам, які вадзіў Эміля Ландаў на працу, быў малады жаўнер Вафэн СС. Ён быў моцна паранены на Ўсходнім фронце, і таму яго часова накіравалі адбываць ахоўную службу ў канцлягеры. Аднойчы немец загаварыў з Эмілем. Высьветлілася, што ім абодвум па 17 год, і абодва паходзяць зь невялікага гораду Вітэн у Руры. “Аказваецца, мы землякі. А чаго ты тут, у лягеры?” — спытаў ахоўнік. “Я тут, бо я гэбрай” — адказаў Ландаў. “Дык гэта-ж ні за што...”

У гэты момант іх заўважыў шарфюрэр (сяржант), які пачаў крычаць, як гэта СС-ман можа ўступаць у прыватныя размовы зь вязьнем. “Сяржант ударыў таго хлопца і павёў яго некуды”, — распавядаў Ландаў. “Я больш ніколі ня бачыў яго. Я думаю, што яго адаслалі назад на фронт. А ён быў такі самы хлопец, як я. Не кажыце мне, што ён ня быў ахвярай злачыннага рэжыму”.

На гэтым гулянка была скончаная. Госьці моўчкі разыйшліся. У наступныя гады Ландаў зрабіў шмат для паразуменьня між немцамі й гэбраямі, распавядаючы маладым немцам пра нацыстоўскае мінулае іхнай — і ягонай — краіны. Эміль памёр у 2007-м годзе. Ён таксама адкідаў ідэю калектыўнай віны. Але ў ягонай прысутнасьці нямецкія сучаснікі лягчэй маглі зразумець, што ёсьць калектыўны сорам.

***Пераклаў Зьміцер ПАРЭЦКІ***

Bielarus557c.qxd 5/29/2009 3:20 PM Page 7




# Весткі й Паведамленьні

нью-ёрскага аддзелу Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня

Viestki j Paviedamlenni

Belarusan American Association, Inc.

166-34 Gothic Drive, Jamaica, N.Y. 11432 Сусьветнае сеціва: www.baza-belarus.org № 6 (521)


# Справаздачна-выбарчы сход аддзелу БАЗА ў Нью-Ёрку

У нядзелю, 17 траўня, у Фундацыі імя П. Крэчэўскага ў Куїньсе адбыўся справаздачна-выбарчы сход нью-ёрскага аддзелу БАЗА. Напачатку сходу старшыня аддзелу Віталь Зайка прапанаваў для вядзеньня выбарчага сходу абраць выбарчую камісію ў складзе чатырох чалавек. Сп. Дворнік прапанаваў абраць мандатную камісію, але яму было растлумачана, што выбарчая камісія ўлучае гэтую функцыю. Затым была абраная выбарчая камісія зь пяці чалавек (Т. Кулакевіч – старшыня, А. Орса-Романо — заступнік, Г. Сурмач — сакратар, В. Балашчанка і М. Агароднік — сябры). Затым адбылася рэгістрацыя сяброў аддзелу для галасаваньня. Умовай удзелу ў галасаваньні было сяброўства ў аддзеле на 10 траўня 2009 г. і заплочаныя сяброўскія складкі за апошні год. У выніку з улікам упаўнаважаньняў было зарэгістравана 46 сяброў з правам голасу.

Затым адбыліся справаздачы старшыні аддзелу В. Зайкі, скарбніка С. Пятровіча і прадстаўніка рэвізійнай камісіі В. Дворніка. Выступоўцы адказалі на пытаньні прысутных, праца была прызнаная задавальняючай і прынятая з абсалютоорыюмам "з падзякай". З справаздачай выступіў таксама сябар управы нью-ёрскага аддзелу Антон Шукелойць. Ён распавёў пра асьветную і дапамаговую працу, якая праводзілася ў 2008-2009 гг.

Пасьля адбылося высоўваньне кандыдатураў на пасаду старшыні нью-ёрскага аддзелу БАЗА. Былі прапанаваныя кандыдатуры сп. сп. В. Зайкі, І. Куніцкага, Т. Кулакевіч і М. Агародніка. Трое з прапанаваных кандыдатаў узялі самаадвод, таму на галасаваньне была пастаўлена толькі кандыдатура В. Зайкі. У выніку 41 голас пададзены за В. Зайку, супраць — не было, 5 устрымаліся. Затым адбылося фармаваньне ўправы аддзелу. Сп. Зайка прапанаваў свой сьпіс кандыдатаў ва ўправу, і была абраная новая рэвізійная камісія ў складзе В. Дворніка, Т. Кулакевіч і З. Левіта. Затым была абраная ўправа аддзелу ў наступным складзе: Марат Клакоцкі (заступнік старшыні), А. Міцкевіч (ганаровы старшыня), Валя Якімовіч (сакратар), Э. Рыжы, Антон Шукелойць, Алла Орса-Романо, Юля Адрусышын, Мікола Цімашэнка, Андрэй Мядзьведзік, Ільля Куніцкі, Мікіта Агароднік.

Пасьля гэтага адбыліся выбары дэлегатаў на Кангрэс БАЗА 30 траўня 2009 г. Выбары праходзілі ад агульнай колькасьць сяброў аддзелу, якія аплацілі сяброўскія складкі за апошні год. Выбіраўся адзін дэлегат ад пяці паўнапраўных сяброў аддзелу. Такім чынам разам атрымалася 25 дэлегацкіх месцаў.

Пасьля агульнай дыскусіі і абмеркаваньня кандыдатураў, якое часам было эмацыйным, 25 дэлегатаў былі абраныя. Сярод іх С. Пятровіч, С. Сарагавец, Т. Кулакевіч, В. Кузьменка, І. Фанская, У. Цяліца, Г. Сурмач, М. Цімашэнка, Н. Брылеўская, А. Мядзьведзік, В. Ракуць, В. Бортнік, С. Чараднікава, Ю. Андрусышын, М. Пацічук, В. Гойдзь, Г. Няфёдава, Ю. Лявоненка, Н. Карповіч, Н. Старавойтава, В. Пілюткевіч, В. Балашчанка, В. Мілюк, А. Грошаў, І. Куніцкі.

**Віталь ЗАЙКА**

# ПАРТНЭРСТВА І ІНТАРЭС

*Заканчэньне з бачыны 3*

Мусіць быць распрацаваная і ўжытая новая тактыка, заснаваная на сумяшчэньні легальнай і нелегальнай дзейнасьці (стыхійна яна ўжо існуе).

Усе гэтыя пытаньні трэба вырашаць, улічваючы эканамічны і сыстэмны крызіс грамадзтва і асаблівую мэнтальнасьць людзей.

Прыклад беларускага ўзаемадзеяньня ў Празе перад падрыхтоўкай да саміту паказаў прынцыповую магчымасьць мэтавага злучэньня антырэжымных сілаў на падставе агульнанацыянальных інтарэсаў. Тым часам праскія назіраньні, слуханьні і наступны за гэтым аналіз выказваньняў і падзеяў прыводзяць мяне да высновы, што праект "Усходняга партнэрства" ўспрыняты рэжымам сур'ёзна (прынамсі на бліжэйшую пэрспэктыву), і спадар Мілінкевіч сьведама выконвае ролю лабі гэтага рэжыму ў Эўропе. Каардынацыя яго паводзінаў з палітыкай рэжыму Лукашэнкі ў праграме "Ўсходняе партнэрства" не выклікае цяпер сумніву. Мяркую, што да гэтага трэба аднесьціся ўважліва, бо лабі, супраца і калябарацыя сярод знаных асобаў будуць павялічвацца.

Трэба разумець прагматычную схему заходнеэўрапейскай палітыкі, якая будуецца на энергетычнай і абароннай бясьпецы ад пагрозы з Усходу. У канцы 90-х і пачатку 2000-х стаўка была зробленая на зьнішчэньне беларускай нацыянальна-дэмакратычнай апазыцыі (Народнага Фронту) і стварэньне сваёй, залежнай ад Захаду, кіруемай апазыцыі на грунце касмапалітычнай дэмакратыі і тэзах аб правах чалавека. Пытаньні аб нацыянальнай культуры і нацыянальным разьвіцьці, аб гарантыях незалежнасьці тут прынцыпова ня ўзгадваліся. Такую "апазыцыю" ім удалося стварыць, расколоўшы Народны Фронт і злучыўшы нешматлікія "дэмакратычныя" партыі. На дзейнасьць дэмапазыцыі выдаткавалі велізныя сродкі (што яе й загубіла – грошы, халява плюс бездзейнасьць).

Укараняючы сваю апазыцыйную схему ў Беларусі, Захад ня гідзіўся таемным супрацоўніцтвам з рэжымам і КГБ (Ганс Вік). Меліся два варыянты разьвіцьця схемы: прывядзеньне да ўлады кіруемай апазыцыі праз электаральныя выбары (сэрбскі варыянт) і ўключэньне Беларусі ў склад Расеі, якую заходнія "чэмбэрлены" называлі "дэмакратычнай" краінай. Расейскі аншлюс, на іх "думку", паспрыяў-бы беларускай дэмакратыі.

Праз восем гадоў апазыцыйнага маразму, які Захад нагарадзіў у Беларусі, правалілася ягоная схема і варыянты. Прытым "чэмбэрлены" так і не зразумелі, чаму электаральная схема спрацавала ў Сэрбіі і не ўдалася ў Беларусі. Хаця адказ элемэнтарны і ляжыць на паверхні. Дэнацыяналізаванае грамадзтва ня ў стане змагацца за свабоду. І Захад (разам са сваёй "апазыцыяй") спрыяў гэтай дэнацыяналізацыі, прынамсі сваім маўчаньнем, калі душылі беларускую мову, зачынялі беларускія школы, палілі беларускія падручнікі, разбуралі беларускія выдавецтвы і кнігадрук, душылі творчыя саюзы, зьдзекаваліся над вялікімі беларусамі.

Шыльдбюргерскую памылковасьць другога варыянту заходнія палітыкі ўбачылі толькі ў 2008 годзе пасьля расейскіх газавых войнаў і ваеннай агрэсіі супраць Грузіі. Тое, што ў Расеі ўсталяваўся гэбізм, і што расейскі антычалавечы рэжым такі-ж антынародны і антыдэмакратычны, як і рэжым у Беларусі, яны зразумелі, аказваецца, толькі цяпер. Вынікам гэтага зразуменьня стала "Ўсходняе партнэрства".

З самага пачатку пранікненьня (1998 г.) заходняй прагматычнай палітыкі ў беларускую антырэжымную барацьбу, мы, фронтаўцы, як і ў выпадку з расейскай "імпэрскай" палітыкай, паказвалі ўсю падступнасьць і небясьпечнасьць яе для Беларусі, выкрываючы яе тактыку і стратэгію, наклікаючы на сябе нянавісьць ды ўлюлюканьне палітычных прафанаў. Цяпер, сутыкнуўшыся з брусэльскім "рэалізмам" наўпрост, яны, як аглушаныя, хапаюць паветра.

Тым часам людзі, якія ўсе гэтыя гады мелі доступ да нашай фронтаўскай інфармацыі і нашай дзейнасьці, ёсьць добра інфарматыўна падрыхтаваныя да таго, што рэальна адбываецца, валодаюць ідэалёгіяй і тэрміналёгіяй сапраўднага дэмакратычнага беларускага змаганьня.

Наша фронтаўская арыентацыя на ўнутраныя палітычныя, сацыяльныя і эканамічныя праблемы, на нацыянальнае асьветніцтва і культуру, на Беларусь застаецца нязьменнай. Але ўвага да эўрапалітыкі мусіць цяпер павялічыцца і набыць канкрэтныя кшталты (аналіз, факты, прапановы і нават праекты). Мы мусім ня толькі сьведчыць, але і рабіць, прапаноўваць дзеяньні для рэалізацыі. Мы (зрэшты, усе арганізаваныя і актыўныя беларусы) павінны будзем змушаць заходніх "партнэраў" да дзеяньняў з намі (і ў нашых інтарэсах) ў той час, калі яны вымушаны супрацоўнічаць з рэжымам. Нашымі саюзьнікамі будуць краіны Скандынавіі і ўсе дзяржавы былой савецкай зоны, дзе шануюць культурную ідэнтычнасьць і добра ведаюць, што такое расейскі імпэрыялізм і якім розумам трэба "понять" Расею.

Новая беларуская апазыцыя вымагае патрыятызму, апоры на нацыянальныя каштоўнасьці і на народ Беларусі. Гэты час будзе цяжэйшым, але можа стаць паваротным. Упэўнена, бяз горычы й страху, спатыкайма яго.

**Зянон ПАЗЬНЯК,**

*Старшыня БНФ "Адраджэньне" і Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ*

## Наступны сход

нью-ёрскага аддзелу БАЗА адбудзецца **14 чэрвеня 2009 году** ў Фундацыі імя П. Крэчэўскага па адрасу:

*166-34 Gothic Drive, Jamaica, NY 11432*

Даезд цягнікам падземкі **F** да прыпынку **169th St**; адтуль 2 блёкі да скрыжаваньня **167-й вул.** і **Готык Драйв.** Пачатак сходу а 1:00 папаўдні.

Уплаты ў нью-ёрскі аддзел дасылайце на адрас:
*Belarusan American Association*
*P. O. Box 230249*
*Brooklyn, NY 11223*
Чэкі выпісвайце на
*Belarusan American Association.*

**Чарговы сход** аддзелу БАЗА ў Нью-Джэрзі адбудзецца **21 чэрвеня 2009 году** апаўдні ў залі пры царкве Божай Маці Жыровіцкай па адрасу:

*9 River Rd*
*Highland Park, NJ 08904*

Наведайце інтэрнэт-старонку *Згуртаваньня Беларускай Моладзі ў Амэрыцы* **www.zbma.net**

Апэратыўная інфармацыя аб падзеях у беларускай дыяспары.

Bielarus557c.qxd 5/29/2009 3:21 PM Page 8



# Медзяны патоп

Пад канец 1650-х гадоў Рэч Паспалітая апынулася ў надзвычай цяжкім палітычным становішчы. У 1654-м пачалося нябачанае дагэтуль варожае нашэсьце на беларускія землі, наступствы якога не зажылі на целе краіны і цяпер, за 350 гадоў. Вайна абярнулася жахлівай катастрофай для некалі разьвітага краю высокае культуры, загінула больш за палову яго насельніцтва. Крызіс паглыбляўся супярэчнасьцямі ўнутры дзяржавы, дзе ходаліся за палітычны ўплыў заможныя магнаты. Дзейнасьць нават на карысьць дзяржавы, калі яна супярэчыла палітыцы караля і Польшчы, магла быць расцэненая як здрада. Шэраг непрадуманых і нязгоджаных рашэньняў паставіў гаспадарства над безданьню. У 1668-м годзе, прадчуваючы далейшы заняпад і зьнікненьне Рэчы Паспалітае з мапы сьвету, адрокся ад пасаду Ян Казімер. Зруйнавала вайна і фінансавую сыстэму краіны.

Крывавы патоп акупацыйнае вайны ўсходніх суседзяў выклікаў іншы, ня менш небясьпечны для здароўя дзяржавы патоп – медзяны. Ува ўмовах імклівага росту й гэтак вялікіх запазычанасьцяў ураду войску, у 1659-м годзе на сейме прымаецца рашэньне выпуску новых крэдытных грошай, накіраваных, перадусім, на пакрыцьцё гэтага доўгу. У тым годзе пасаду земскага падскарбія Вялікага Княства Літоўскага займаў слынны палітычны дзяяч гаспадарства Вінцэнт Гасеўскі. Адылі, адказным за арганізацыю манэтнае вытворчасьці стаў не заняты на вайсковай службе палявы гетман, а Адам Мацей Саковіч. Яму было даручана адчыніць мынцу ў Берасьці, бо Вільня была занятая ворагам. Трагедыя сталічнага места, якое здаўна ня ведала акупацыі і рабункаў, выявілася ў тужлівай песні:

Устань, устань, Радзівіла,  
А ўжо Вільня не наша,  
А ўжо Вільня не наша,  
А ўжо белага цара...

Згодна з праектам італьянца Ціта Ліва Баратыні плянавалася выбіць медзяных шэлягаў на 1 мільён залатовак для ВКЛ і на гэтулькі-ж для Польшчы. Непаўнавартасныя шэлягі меліся быць выпушчаныя ў абарачэньне па прымусовым курсе ў 1/3 срэбнага гроша пры рэальным кошце ў 1/20. Урэшце рэшт, мынцу ў Берасьці не адчынілі, а пастанавілі перанесьці эмісіі далей ад непрыяцеля ўглыб Польшчы, у правінцыйны Уездаў. Гэнам, з таго-ж году пачаліся эмісіі каронных шэлягаў, а налета і літоўскіх. Гэта быў



*Уездаўская баратынка*

першы выпадак, калі эмісіі манэтаў Вялікага Кянства былі вынесеныя за межы гаспадарства. Гэты факт, як і шмат іншых, усё выразьней праяўляў павевы страты беларускай дзяржавай свайго адметнага аблічча і самастойнасьці ў прыняцьці рашэньняў.



*Берасьцейская баратынка*

Баратыні быў выбітны навукоўца і заможны чалавек, які жыў у Польшчы яшчэ з 1641-га году. Ягоныя зацікаўленьні абдымалі вялікую колькасьць тэхнічных навуковых дысцыплінаў, у некаторых зь якіх Баратыні дасягнуў значных посьпехаў. Ня гэтак удалымі былі пачынаньні італьянца ў навуцы эканамічнай. Ён пачаў ляндаваць мынцу ў Кракаве яшчэ ў 1658-м годзе, а ў наступным годзе высунуў вышэйзгаданы плян выбіцьця медзяных шэлягаў, якія неўзабаве атрымалі мянушку "баратынчыкі". За сваю няўдалую спробу аздараўленьня фінансаў Рэчы Паспалітае Ціта Ліва не аднойчы намагаліся прыцягнуць да адказнасьці, але кожнага разу яму ўдавалася высьлізнуць, абгрунтаваўшы адпаведнасьць сваёй дзейнасьці пастанаўленьням сойму. Гэткім парадкам Баратыні працягваў займацца ляндаваньнем мынцаў краіны яшчэ два дзесяцігодзьдзі і нечувана павялічыў сваё багацьце за кошт недалужных палякаў і ліцьвіноў.



*Віленская баратынка*

Не магло йсьці й гаворкі аб прыйме баратынак паняверанным насельніцтвам, як паўнавартасных удзельнікаў грашовае сыстэмы, заснаванае на срэбных наміналах. Замест гэтага стваралася паралельная сыстэма разьлікаў медзяй, што выявілася ў тагачаснай прымаўцы "Прайшоў час срэбны, а наступіў медзяны".

Эмісія 1660-1661 гадоў не разьвязала праблемы пазыкі войску. У 1663-м годзе акцыю паўтарылі, ды не спыняліся да 1666-га году. Замест заплянаваных 2 мільёнаў залатовак, выпусьцілі каля 18 мільёнаў медзянымі шэлягамі. У тыя-ж тэрміны да пагаршэньня сытуацыі спрычыніўся і іншы фінансіст-ратавальнік – Андрэй Тымф, якому ўдалося пераканаць урад, што "ягоныя чэрці – не аднае шэрсьці" з баратынаўскімі. Прафэсійны



*Ковенская баратынка*

нямецкі мыцмайстар прыехаў у Рэч Паспалітую ў пачатку 1650-х, дзе пачаў дзяржаць рэгіянальныя мынцы ў Познані і Ўсхове. Паступова яму ўдалося перахапіць ініцыятыву ў Баратыні. Тымф займае пасаду сьпярша генэральнага прабіра, затым суперінтэнданта ўсіх польскіх мынцаў. Урэшце, немец атрымлівае кантроль над мынцамі Кракава, Быдгашчы і Львову. Ён высунуў праект выбіцьця іншага гатунку крэдытных манэтаў – 30-грашовых срэбных залатовак-тымфаў. Іхняя рэальная вартасьць мелася складаць 40% ад намінальнае. Адчайныя спробы Баратыні не дапусьціць канкурэнта да дзяржзамоваў не дасягнулі посьпеху, нягледзячы на тое, што італьянец прывёў колькі даволі разумных довадаў на карысьць сваіх шэлягаў у параўнаньні з залатоўкамі:

- медзяны шэляг, адрозна ад тымфа, ня можа выклікаць павышэньня курсу іншых срэбных і залатых наміналаў;
- ягоная вытворчасьць параўнальна таньнейшая, што асабліва важна для краіны зь нязначнай колькасьцю собскіх радовішчаў срэбра;
- падробкі медзяных манэтаў цяжэй экспартуюцца замежнымі фальшарамі, бо вага аднолькавае сумы ў баратынках і тымфах розьнілася ў 18 разоў;
- з заканчэньнем вайны з грашовага абарачэньня Рэчы Паспалітае мусілі быць выдаленыя замежныя нізкапробныя манэты, пасьля чаго курс медзяных солідаў, патрэбных для штодзённых дробных платаў, падняўся-б.

Нягледзячы на пярэчаньні Баратыні, у Кароне ў вялікіх колькасьцях былі выбітыя тымфы, якія хутка зраўняліся па курсе з 18-грашовымі ортамі. Недавыканаўшы свой кантракт, Тымф зьбег у Нямеччыну, пакінуўшы дзяржаву ў яшчэ большым крызісе. Непапулярныя меры дапамаглі хвораму арганізму гаспадарства на хвіліну, а затым станавілася яшчэ горш.

18 мільёнаў залатовак – гэта больш як паўтары мільярды крэдытных медзяных шэлягаў, якія засьцілі ўсю іншую манэту, што абарачалася ў краіне. Баратынкі выбіваліся ў шалёным тэмпе, гэтак, што нават аліўскія выпускі, якія доўжыліся меней за чатыры месяцы, не ёсьць нечым рэдкім у беларускіх скарбах сёньня. У абарачэньне выходзілі манэты з дэфектамі, падвойна адбітыя ці бракаваныя наагул, як аднабаковая аліўская баратынка зь ілюстрацыі ніжэй.



*Аліўская баратынка*



*Бракаваная аліўская баратынка*

Высокая хуткасьць вытворчасьці рабіла менш дзейсным нагляд за яе сумленнасьцю. Даволі вялікая розьніца ў таўшчыні і вазе баратынчыкаў сьведчыць на карысьць злоўжываньняў манэтных майстраў, якія наўмысна памяншалі памер манэтаў дзеля атрыманьня дадатковага прыбытку.



*Тагачасная падробка літоўскае баратынкі*

Істотна спрашчалася задача і прыватных фальшароў. Не вымагалася ўжо паніжаць вагу ці пробу металу – трэба было толькі дакладна паўтарыць манэту і значны прыбытак быў забясьпечаны. Такім чынам, фальшывыя баратынкі была няпроста адрозьніць ад сапраўдных, дый навошта – фалшывыя баратынчыкі напару нават цяжэйшыя ад афіцыйна эмітаваных шэлягаў. Нягледзячы на суворыя пакараньні, прадпрымальныя сучаснікі спрычыніліся да павелічэньня колькасьці гэтае манэты ў абарачэньні Рэчы Паспалітай хіба не ўдвая. Часам сфалшаваныя баратынчыкі прымалі дзівосную форму, напрыклад, каралю надакучвала бачыць нядолю ліцьвіноў на Усходзе і ён "паварочваў галаву" на Захад.



*Тагачасная падробка кароннае баратынкі з "нетрадыцыйнай" арыентацыяй партрэта Яна Казімера*

***Дзьмітры ГУЛЕЦКІ***
***dhulecki@belcoins.com***

## Лісты ў рэдакцыю

Кароткае паведамленьне аб гадавіне сьмерці сьв. пам. доктара Сяргея Малафеева ("Беларус" № 555) патрабуе малой папраўкі і ўдакладненьня.

Др. С. Малафееў памёр у 1969 годзе ў польскім вайсковым шпіталі, які разьмяшчаўся каля вёскі Пэнлей (Penley) у Валіі 15 км на поўдзень ад гораду Ўрэксгам (Wrexham).

Ён не змагаўся зь немцамі пад Табрукам. Калі былі баі за Табрук (Лібія), др. Малафееў быў яшчэ ў СССР.

Др. Малафееў пахаваны на Паўднёвых могілках (Southern Cemetery) у горадзе Манчэстэры (Manchester) у Англіі на малым участку, дзе ляжаць праваслаўныя беларусы, расейцы і ўкраінцы. Хтось, хіба палякі, паставілі там помнік, на якім выбіты надпіс на польскай мове.

***Міхась ШВЭДЗЮК, Англія***

Паважаны Спадару рэдактар!

Сёлетні год, як усім Вам ведама – юбілейеы – 1000 год ад успаміну назову "Літва" ў пісаных крыніцах і 480-я ўгодкі І-га Статуту Вялікага Княства Літоўскага.

Наступны, 2010-ы, таксама, бо будзе 600 год ал перамогі над крыжакамі пад Грунвальдам.

З гэтых прычынаў ды й на здаровы розум наагул, я думаю, што нам абавязкава трэба перастаць рабіць самым сабе ўсьцяж шкоду, (а нашым непрыяцелям дагоду), называючы нашую паўночна-заходнюю суседку нашым-жа гістарычным, а можа яшчэ ў прыйсьці й вернутым імём "Літва", а ейных жыхароў "літоўцамі".

Замест гэтага давайце іх называцьвем так, як яны сябе самыя ахрысьцілі, г. зн."Lietuvaj" і "letuvisami", ці, пішучы кірыліцай, "Летува, летувіс, летувіскі".

Я ня сумняваюся, што Вы разумееце значаньне прыпамненьняў гэтае праўды для ўздыму й захаваньня нацыянальнае сьведамасьці, а таксама пашаны да гістарычнае спадчыны сярод нашых суродзічаў ды возьмеце маю прапанову на ўвагу, за што я й нямала маіх аднадумцаў будзем Вам моцна ўдзячныя.

З глыбокай пашанай

***Барыс ДАНІЛЮК***

Bielarus557c.qxd 5/29/2009 3:21 PM Page 9



# Рэцэнзія




**Беларускі кангрэсавы камітэт Амэрыкі (БККА)** / ***Алег Гардзіенка***. — Смаленск, 2009. — 428 с., [12] с. іл.

Загортваеш гэтую кнігу й ня можаш пазбавіцца прыкрага пачуцьця: наколькі-ж няўдалая назва кнігі! Бо дасьледаваньне ня толькі пра Кангрэсавы Камітэт — ейны зьмест нашмат шырэйшы; яна дае больш, як абяцае.

Пасьля выхаду ў далёкім 1993-м годзе кнігі В. Кіпеля "Беларусы ў ЗША" здавалася, што тэма прысутнасьці беларусаў у Амэрыцы вычарпаная, што да яе можна хіба дадаваць асобныя сюжэты, імёны, але гісторыя напісаная. От-жа не! — цьвердзіць новая праца супрацоўніка "Нашай Нівы", ведамага сваймі артыкуламі пра паваенных беларусаў у Нямеччыне й Вялікай Брытаніі, рэдактара шэрагу кнігаў пра нашую эміграцыю, найлепшага — разам з сваею жонкаю гісторыкам Натальляй Гардзіенка — знаўцы гэтае тэмы ў Беларусі.

У дачыненьні да кнігі А. Гардзіенкі азначэньне "ўпершыню" бадай самае трапнае. Упершыню — спакойна, узважана й бесстаронньне — разглядаецца дзейнасьць арганізацый, што належалі да плыні БЦР. І — быццам-бы адвазочнае — робіцца зразумелым: той далёкі палітычны ды й рэлігійны падзел, рэха якога можна адчуць і сёньня, ня толькі нарабіў вялікую шкоду ўсім нам, але й паўстаў фактычна на пустым месцы (амбіцыях, крыўдах, непаразуменьнях) сярод беларусаў, што бяз вынятку вызнавалі ідэалы 25 Сакавіка.

Упершыню падаецца шырокі фон 1950-х гадоў — росквіту палітычнае эміграцыі, супраца й кантакты зь небеларускімі арганізацыямі; аўтар удала "ўпісвае" дзейнасьць Кангрэсовага Камітэту ў агульную карціну падзей Амэрыкі часоў халоднае вайны.

Кніга вельмі важная й для такой занядбанай у нас галіны, як біяграфіка. Нарэшце чытач можа даведацца пра жыцьцё й паваенныя лёс Івана Ермачэнкі, Івана Касяка, братоў Шчорсаў, Расьціслава Завістовіча — і цэлага шэрагу сяброў Камітэту, біяграфіі якіх зьмешчаныя ў адмысловым разьдзеле, — 51 асоба!

Асобна хочацца адзначыць — і падзякаваць аўтару — за запісаныя ўспаміны Л. Брылеўскай, Л. Касоўскай, Б. Кіта. Чарговы раз пераконваесься, наколькі нельга адкладаць гэтую справу: праз кароткі час па заканчэньні сваіх успамінаў Лёнгіна Брылеўская памерла.

Цікавыя, хоць, напэўна, найбольш спрэчныя старонкі кнігі, прысьвечаныя царкоўным праблемам, тэме дражлівай і небясьпечнай для кожнага гісторыка. Магчыма, каб аўтар спасылаўся на крыніцы ня толькі з аднаго лягеру, карціна-б атрымалася не настолькі спрошчанаю і адназначнаю.

У цэлым кніга, як было зазначана на пачатку, сапраўды багатая: тут і гісторыя Лофтуса, пра якога нядаўна пісаў "Беларус", і ліставаньне дзеячоў Камітэту, і дакумэнты арганізацыі, і вельмі-ж патрэбныя росьпіс усіх нумароў часапісу "Беларуская Думка".

Не надаецца паважным рэцэнзэнтам, да якіх сябе цешыць надзеяй залічваць аўтар гэтых радкоў, закідаць кнізе адсутнае ў ёй — і не плянаванае, але ў чытача застаецца неспатоленая цікавасьць і да больш падрабязнай гісторыі беларускага гарадку Саўт-Рывер, да адзіных ў сьвеце, разам з суседнімі ў Нью-Брансўіку — беларускіх могілак, і да шырэйшага аповяду пра штодзённае жыцьцё эмігрантаў.

Ацэньваючы-ж кнігу агулам, хочацца пажадаць, каб кожная нашая арганізацыя займела такога летапісца.

***Л. ЮРЭВІЧ***

# Беларуская жанчына

**(*сьв. пам.* Раіса ЖУК-ГРЫШКЕВІЧ (22.10.1919 – 02.04.2009))**



Як балюча адчуваць страту такога цудоўнага чалавека, якім была Раіса Жук-Грышкевіч. Я пазнаёміўся зь ёю на чарговым зьезьдзе Згуртаваньня Беларусаў Канады у 1999-м годзе. Першае ўражаньне было такім, што гэтая жанчына можа выйсьці на барыкады і павесьці людзей за сабою. Запомнілася яна тады сваёй палымянай прамовай, а потым перакананымі і абгрунтаванымі выступамі. У іх адчувалася дэталёвае веданьне беларускага жыцьця, настойлівасьць, багаты вопыт і ўпэўненасьць у канчатковым посьпеху змаганьня за свабоду і незалежнасьць нашай Беларусі. Яна верыла, што вызваленьне нашай краіны з рабства рана ці позна адбудзецца. І ня толькі верыла ў гэта, але і многа працавала на карысьць беларускай справы. Варта пералічыць тыя справы, у якіх яна прымала самы непасрэдны удзел: стварэньне Каардынацыйнага Камітэту Беларусаў Канады (ККБК) і праца ў ім у якасьці кіраўніка, рэгулярнае выданьне і распаўсюд камунікатаў ККБК, усталяваньне ў Мідлэнд (Антарыё) Беларускага Крыжа і помніка ахвярам камуністычных рэпрэсіяў у Беларусі, напісаньне і выданьне кнігі "Жыцьцё Вінцэнта Жук-Грышкевіча" (1993), матэрыяльная падтрымка шматлікіх праектаў у Беларусі, аўтарства многіх артыкулаў у беларускіх выданьнях за мяжою і на Радзіме, актыўны удзел у працы Згуртаваньня Беларусаў Канады і Канадыйскага сэктару Рады БНР ... Усяго не пералічыць. У яе былі пляны і на далейшае. Яна пакінула рукапіс кнігі "Запісы. Беларускае Грамадзтва 2-й паловы XX стагодзьдзя ў Канадзе", які яна прасіла разглядаць як другую частку кнігі "Жыцьцё Вінцэнта Жук-Грышкевіча". Гэту другую кнігу яна пачала ў Бэры ў 2005-м годзе і ўжо не пасьпела яе скончыць.

На выгляд часам вельмі строгая, яна была вельмі эмацыйным і адкрытым чалавекам, калі справа тычылася Беларусі. Я некалькі разоў бываў у яе хаце ў Бэры, дзе яна з такім захапленьнем расказвала аб беларускім жыцьці, і гэта заўжды было ў яе на першым месцы. Часткова гэтую эмацыйнасьць, яе перажываньні і хваляваньні, можна адчуваць на старонках камунікатаў, якія яна штомесяц рыхтавала і рассылала па ўсім сьвеце. Вельмі часта яна напаміналa, што патрэбна аб усіх падзеях, якія адбываюцца ў беларускім асяродзьдзі, пісаць у кнігах і артыкулах. Вельмі крытычна ставілася да электронных сродкаў інфармацыі: казала, што публікацыі, зьмешчаныя у інтэрнэце, могуць згубіцца, забыцца і г. д.

Падчас паломніцтва да Беларускага Крыжа ў Мідлэнд у 2000-м годзе я ішоў побач зь ёю ад касцёлу наверх, і мы тады ўпершыню сьпявалі ўсе разам "Люрдаўскую песню" ў перакладзе на беларускую мову, які яна загадзя падрыхтавала і раздала прысутным. І хоць усе мы дакладна ня ведалі мелёдыю, але выкананьне гэтай песьні яе вельмі захапіла і ўзрадавала.

Неяк пазьней яна прыслала мне песьню "Раманс-Вальс", якую яна, відаць, вельмі любіла. Я патэлефанаваў ёй і папрасіў узгадаць мэлёдыю, і тады-ж яна сказала, што гэтую песьню моладзь сьпявала на вечарынах у Пружанах. Вось гэты раманс-вальс ў тым выглядзе, які я атрымаў:

Зайшло ўжо сонейка, цень лёг на гонейка,
ўецца туман сенажа-аці.
Выйдзі, дзяўчынка, выйдзі, галубка,
ў садзік ка мне пагуля-аці.

*Апошія 2 радкі паўтараюцца.*

Хвілямі шыбкімі ў цені пад ліпкамі
час нам праходзіць бу-удзе.
Будзе прыветліва пець салавейка,
буду слугой, Ты цары-ыцай.

Хвілямі шыбкімі ў цені пад ліпкамі
час нам праходзіць бу-удзе.
Бачыць нас будуць зоры й месяц,
бачыць ня будуць нас лю-удзі.

Зайшло ўжо сонейка, цень лёг на гонейка,
ўецца туман сенажа-аці.
Выйдзі, дзяўчынка, выйдзі, галубка,
ў садзік ка мне-э пагуля-аці.

Перад яе апошнім днём народзінаў у верасьні 2008-га году я выслаў спадарыне Жук-Грышкевіч верш-прысьвячэньне. У дзень народзінаў я тэлефанаваў ёй. Доўга чакаў, пакуль яна падыйдзе і падыме трубку тэлефона. Яна ў той час ужо была даволі слабая. Павіншаваў яе. Пасьля кароткай размовы, яна толькі заўважыла адносна прысьвечанага ёй вершу, што яна простая беларуская жанчына. Так, яна была беларуская жанчына, сапраўдная патрыётка і грамадзкі дзеяч, якую будуць помніць людзі, якія мелі гонар ведаць яе як сябра, настаўніка, дарадцы. Жыцьцё яе працягваецца ў ейных справах, у нашай памяці і на небе.

## Спадарыні Раісе Жук-Грышкевіч

Ў рэвалюцыі-слове адразу я бачу "Пагоню",
І ня вершнік знаёмы — жанчына красуе ў сядле,
Востры меч у руках, сотня коньнікаў зь ёй начале,
Што як вецер ляцяць, не стрымаць анікому тых коней.

Твар адкрыты у вершніцы, ў ім і адвага, рашучасьць,
Вера ў праўную справу — гнаць ворага з роднай зямлі,
Як дзяды, што змаганьне з нахабствам вякамі вялі —
Іхны подзьвіг запіша свабодны народ ў неўміручасьць.

Шчокі ярка гараць бы пунцовыя ружы у садзе,
У Пружанах, Ружанах, у краі прыгожых мясьцін,
То адзнакаю шчырасьці ёсць і таму напамін,
Палыханьне на лісьцях кляновых ў далёкай Канадзе.

Сэрца песьні пяе пра сяброў і дзявочыя мары,
Пра цудоўны лужок, дзе пад сонейкам кветкі цьвілі,
І аб любым, з кім разам змагарнай дарогай ішлі,
Дзе шмат цяжкасьцяў мелі і славу пазналі напару.

Дзе "Пагоня" імчыць — паўсюль кліча на бітву за волю,
Ўзняла крыж беларуска людзей бараніць ад бяды,
Ды палае свабоды агонь у яе праз гады,
Каб вясьці свой народ да шчасьлівае, лепшае долі.

Зноў "Пагоня" ляціць са штандарам на годнасьць і
лучнасьць,
Колькі высілкаў зроблена, колькі шчэ трэба зрабіць —
Павясьці за сабой,
абудзіць,
запаліць,
не згубіць —
Таму ёй быць наперадзе Богам падорана мужнасьць.

***Пётр П. МУРЗЁНАК***
***Атава, 4 травеня 2009 года***

Bielarus557c.qxd 5/29/2009 3:22 PM Page 2



# Каляндар "БЕЛАРУСА"





**13 чэрвеня 1949 г.** беларусы зь лягеру для перамешчаных асобаў у Остэргофэне былі перавезеныя ў Розэнгайм. Сюды таксама перавезьлі нашых землякоў з Віндзішбергердорфу, Шлясгайму, Альтэнштэту. У Розэнгайме працавалі дзіцячы садок, пачатковая школа, аднавіла працу пасьля чарговага пераезду Беларуская гімназія імя Янкі Купалы, была заснаваная незалежная ад РЗПЦ праваслаўная парафія. Менавіта тут у сьнежні 1949 г. быў хіратанізаваны ў япіскапы БАПЦ Уладзімер Тамашчык (пад імем Васіль). Лягер у Розэнгайме праіснаваў да жніўня 1950 г.

**16 чэрвеня 1999 г.** у Аўстраліі памёр грамадзкі дзеяч **Мікола Нікан** (нарадзіўся ў 1908 г. у Варшаве). Нікан у 1939 г. быў рэпрэсаваны і высланы ў Варкуту, адкуль трапіў у Армію Андэрса. У шэрагах 2 польскага корпусу прайшоў праз Сірыю, Эгіпет, удзельнічаў у ваенных дзеяньнях у Італіі. У 1947 г. апынуўся ў Вялікабрытаніі, дзе ў 1950-1951 гг. быў старшынём ЗБВБ. У 1952 г. зьехаў у Аўстралію (Мэльбурн), дзе браў актыўны ўдзел у беларускім грамадзкім жыцьці.

**20 чэрвеня 1964 г.** памёр **Пётра Сыч** (нарадзіўся ў 1912 г. у в. Батурына, сёньня Вялейскі раён). Служыў у польскім войску. У 1939 г. трапіў у савецкі палон, уцёк, але быў арыштаваны і асуджаны на 10 гадоў лягераў. Ад сьмерці ў лягеры выратавала Армія Андэрса. Пётры Сыч браў удзел у бітве за Монтэ-Касіна, баях за Анкону і Балёнію. Па вайне некаторы час жыў у Вялікабрытаніі, дзе спрычыніўся да разбудовы беларускага жыцьця. У 1951 г. пераехаў у Мюнхэн. Працаваў у Беларускай рэдакцыі Радыё "Вызваленьне". Аўтар шчымлівай аповесьці "Сьмерць і салаўі" пра ўдзел беларусаў у штурме Монтэ-Касіна. У прадмове да кнігі ён пісаў: *"18 траўня 1944 г. паддалося Монтэ-Касіно. Я меркаваў пісаць пра гэтую жахлівую бітву ў 50-я ўгодкі, пазьней перадумаў і пералажыў на 25-я. Аднак чую, што да 1969-га году не дацягну хамута існаваньня. Часам выглядае, што магу пераканаваць у лепшы сьвет і перад 20-мі. Таму спрабую напісаць крыху ўспамінаў з тых цяжкіх часоў, калі й Беларусы шчодра абмылі сваёй крывёй шурпатыя, дзікія горы каля манастыра Монтэ-Касіно. ... Проста ўспаміны аб тых, каго знаў, аб тым, што ведаў, бачыў і перажыў"*.

100 гадоў таму, **26 чэрвеня 1909 г.** у Менску нарадзіўся **Антон Адамовіч**, бліскучы літаратуразнаўца, дасьледчык, адна з цэнтральных фігур на эміграцыі. А. Адамовіч быў сярод заснавальнікаў газэты "Бацькаўшчына" і аднаўляльнікаў Рады БНР, а потым шмат спрычыніўся да яе ідэалягічнага афармленьня. Быў ён і сярод заснавальнікаў Беларускага Інстытуту Навукі і Мастацтва.

**У канцы чэрвеня 1944 г.** пачаўся "Вялікі Сыход": дзясяткі тысяч нашых суайчыньнікаў рушылі ў невядомасьць на Захад, баючыся вяртаньня савецкай улады. Каб не эміграцыя 1944 г. не было-б, відаць, ні беларускай Амэрыкі, ні беларускай Канады, Англіі, Аўстраліі і г. д. Безумоўна, у канцы XIX – пач. XX ст., напрыклад, у ЗША прыехалі ў дзясяткі разоў болей нашых землякоў. Але трывалыя беларускія арганізацыі, рэгулярную прэсу (газэту "Беларус"), цэрквы, беларускія могілкі стварыла менавіта паваенная эміграцыя.

**А Г**

# КУПАЛЬЛЕ

**Запрашаем разам адзначыць старадаўнюю рамантычную традыцыю КУПАЛЬЛЯ і правесьці незабыўны адпачынак у кампаніі суродзічаў на ўлоньні прыроды.** Купальскі вечар пачнецца з прызначэньня Князя-Купаліша і Купалінкі, якія распаляць вогнішча. Уночы нячысьцікі выкрадуць Купалінку. Каб даведацца пра іншыя падзеі і абрады купальскай ночы далучайцеся да нас. Частуйцеся крупнікам, у склад якога па традыцыі ўваходзяць 50 лекавых траваў. Можа каму з вас пашанцуе знайсьці сваю папараць-кветку ў гэтую чароўную ноч.

**Калі:** **20-21 чэрвеня 2009 году** (Купальская ноч у суботу 20 чэрвеня).

**Дзе:** Парк ***Ward Pound Ridge Reservation*** у ***Cross River, NY 10518***

**Транспарт:** цягніком са станцыі ***Grand Central*** да прыпынку ***Katonah***. Гэта прыкладна гадзіна язды цягніком ад Мангэтану на ***Metro North, Harlem Line***.

**Кошт:** **$25** дарослым, **$10** дзецям меншым за 12 год. Чэкі выпісвайце на ***Mr. & Mrs. Ryzy*** з адзнакаю "***Купальле***" і дасылайце разам з формаю, надрукаванаю ніжэй, на адрас:
***Piotr & Lena Ryzy***
***P. O. Box 1952***
***Ossining, NY 10562***

**Кантакты:** **Пётра** і **Алена РЫЖЫЯ**, тэл. **(914) 522 - 0742**, эл. пошта: ***LenaBelarus@aol.com***

**Што будзе:** купальскія песьні й танцы на працягу ўсёй ночы, спартовыя спаборніцтвы й гульні, гатаваньне страваў (прыносьце ежу, грылі там будуць).

**Захапіце з сабою:** - беларускія строі ці адзеньне з сымболікай; дзяўчатам - доўгія спадніцы, хлопцам - доўгія сьветлыя штаны, ня шторты (толькі на час сьвяткаваньня);
- ежу, напоі, спальныя мяшкі, намёты, калі будзеце спаць;
- **$8** (з аўта ў незалежнасьці ад колькасьці пасажыраў) за ўезд у парк (бясплатна пасьля 5-й гадзіны вечара).

Арганізатары забясьпечаць пітную ваду і паліва для вогнішчаў і грыляў.

**УВАГА! Колькасьць удзельнікаў абмежаваная (умовамі парку) да 40 чалавек, таму дасылайце рэгістрацыі загадзя.**

**Імя:** ________________________________

**Дарослых ($25):** ___, **дзяцей ($10):** ___ **Усяго дасылаю: $** _____

**Ваш тэлефон:** ______________ **E-mail адрас:** ______________

**Паштовы адрас:** ________________________________

________________________________

**Ці трэба Вас забіраць з прыпынку цягніка?** ___ **Калі?** ________

**Ці даслаць Вам мапу з інструкцыяй, як даехаць да парку?** _____

# ПАДПІСКА

## на выданьні зь Беларусі на другую палову 2009 году

### З дасылкаю зь Беларусі ў замежжа:

| | Назва, выдавец, мова | Перыядыч. друку | Кошт, $ |
|---|---|---|---|
| Газэты: | **Наша Ніва**, прыватная, беларуская | 4 на месяц | 80 |
| | **Наша Слова**, ТБМ, беларуская | 4 на месяц | 35 |
| Часапісы: | **Arche**, прыватны, беларуская | 5 на 6 месяцаў | 75 |
| | **Дзеяслоў**, прыватны, беларуская | 3 на 6 месяцаў | 35 |

### Жыхарам Беларусі (з аплатаю ў ЗША):

| | Назва, выдавец, мова | Перыядыч. друку | Кошт, $ |
|---|---|---|---|
| Газэты: | **Наша Ніва**, прыватная, беларуская | 4 на месяц | 25 |
| | **Наша Слова**, ТБМ, беларуская | 4 на месяц | 10 |
| | **Народная Воля**, прыват., бел., рас. | 16 на месяц | 24 |
| Часапісы: | **Arche**, прыватны, беларуская | 5 на 6 месяцаў | 16 |
| | **Дзеяслоў**, прыватны, беларуская | 3 на 6 месяцаў | 10 |

Па інфармацыю зьвяртайцеся на адрас: ***hazetabielarus@att.net***
***Заўвага:*** *газэты дасылаюцца авіяпоштаю, часапісы звычайнаю.*
***Дасылайце замовы і аплату да 15 чэрвеня 2009 г. на адрас рэдакцыі.***
***Чэкі, калі ласка, выпісвайце на імя BIELARUS.***

24 красавіка сёлета споўнілася 65 год выбітнаму змагару за незалежную Беларусь **Зянону ПАЗЬНЯКУ**. Ён нарадзіўся ў сям'і, дзе панаўцьце Радзіма-Беларусь было сьвятым. Дзеля яе аддалі свае жыцьці ягоны дзед Ян, бацька Станіслаў, родны дзядзька Ясь.

Палітыка зачапіла Зянона Пазьняка вельмі рана і на ўсё жыцьцё. Але калі лічыць ад 1989 году, калі быў утвораны БНФ і ён быў абраны ягоным Старшынём, то сёлета яшчэ адзін юбілей З. Пазьняка – 20 год няспыннага палітычнага лідэрства ў Беларускім Адраджэньні.

20 год палітыкі і змаганьня кожны дзень. Здавалася-б, такая нагрузка (інтэлектуальная, фізічная, духоўная) чалавеку не да вытрымоўваньня. Але ахвярны шлях дзеля Бацькаўшчыны, як у Зянона Пазьняка, дае прыклад высокага сэнсу жыцьця Патрыёта, каб вечна жыла сьвятая зямля, якая завецца Беларусьсю.

**Жадаем Зянону Пазьняку моцы, здароўя і ажыцьцяўленьня мары – убачыць вольную і магутную Бацькаўшчыну. ЖЫВЕ БЕЛАРУСЬ!**

***У. Целіца*** *ад імя сяброў і прыхільнікаў*

## НА ВЫДАВЕЦКІ ФОНД "БЕЛАРУСА" АХВЯРАВАЛІ:

**Б. Данілюк** ................ **50**
**Л. Літаровіч** ................ **50**
**Л. Франке** ................ **50**
**П. Грыгальчык** ............ **15**
**Усім шчыры дзякуй!**


# БЕЛАРУС

*Газэта Беларусаў у Вольным Сьвеце*

**Выдае штомесячна:**
***Беларуска-Амэрыканскае Задзіночаньне***
**Сусьветнае сеціва:** ***baza-belarus.org***

**Падпіска $50 на год.**
**Чэкі выпісвайце на *BIELARUS***

# BIELARUS

*Belarusan Newspaper in the Free World*

Published monthly by
***Belarusan American Ass'n, Inc.***
Subscription $50 yearly
Make checks payable to ***BIELARUS***

**Рэдагуе калегія.**
**Адказны рэдактар Марат КЛАКОЦКІ**
**Падпіска Сяргей ТРЫГУБОВІЧ**

**Артыкулы, падпісаныя прозьвішчам ці ініцыяламі, могуць зьмяшчаць погляды, зь якімі Рэдакцыя не згаджаецца.**
**Перадрук дазваляецца толькі пры ўмове зазначэньня крыніцы.**

© BIELARUS, 2009

**Адрас для допісаў і кантактаў:**
***BIELARUS***
***P.O. Box 3225***
***Farmingdale, NY 11735***
E-mail:
***hazetabielarus@att.net***
**Сусьветнае сеціва:**
***www.bielarus.org***

ISSN 1054-9455

**Адказнасьць за зьмест рэклямы нясе рэклямадаўца.**